# ВЫТОКІ ТРАДЫЦЫЙ: БЯРОЗАЎСКАЯ РАЁННАЯ ГАЗЕТА «МАЯК»

***Г. К. Тычко***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*tychko@mail.ru*

Рэгіянальныя выданні вызначаюцца набліжанасцю да аўдыторыі, цеснай сувяззю з гісторыяй і праблемамі роднай мясцовасці. У дакументальна-мастацкіх вобразах на іх старонках паўстае жыццё роднага краю, якое вучыць патрыятызму, адданасці родным каранням. Газета «Маяк» Бярозаўскага раёна мае ўнікальныя традыцыі, вызначаныя як гістарычным кантэкстам, так і аўтарскім калектывам. Рэдакцыйная палітыка ў перыяд 70–90-х гадоў ХХ ст. спрыяла вылучэнню газеты ў лік лепшых выданняў Брэстчыны. Кантэнт сённяшняга «Маяка» вызначаецца пераемнасцю лепшых традыцый мінулага.

***Ключавыя словы:*** рэгіянальная прэса; Бяроза, газета «Маяк», гістарычны кантэкст, творчыя індывідуальнасці, пераемнасць традыцый.

# ORIGINS OF TRADITIONS: BEREZOVSKY AREA NEWSPAPER THE MAYAK

***H. K. Tychko***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: H. K. Tychko (tychko@mail.ru)*

Regional periodicals are characterized by proximity to the audience, close connection with the history and problems of the native land. The life of the native land, which teaches patriotism, devotion to native roots is presented in documentary and artistic images on their pages. The newspaper «Mayak» of Berezovsky area has unique traditions defined both by its historical context, and watting staff collective. Editorial policy in the 70–90s of the twentieth century, contributed to the nomination of the newspaper as one of the best periodicals in Brest region. The content of today’s «Mayak» is determined by the continuity of the traditions of the past.

***Key words:*** regional print media; Bereza; the Mayak newspaper; historical context; creative personalities; continuity of traditions.

Рэгіянальныя выданні, і найперш раённыя газеты, вызначаюцца сярод іншых СМІ Беларусі сваёй набліжанасцю да аўдыторыі, заангажаванасцю спецыфікай, гісторыяй і праблемамі сваёй малой радзімы. Са старонак гэтых выданняў паўстае непаўторная панарама жыцця людзей канкрэтнай мясцовасці, – па-сутнасці, у дакументальна-мастацкіх вобразах гісторыя роднага краю, якая вучыць і патрыятызму, і адданасці родным караням. Адным з такіх унікальных выданняў якраз і з'яўляецца бярозаўская раённая газета «Маяк», чаму ў немалой ступені спрые і яе геаграфічнае месцазнаходжанне. Бяроза (раней Бяроза-Картузская) упершыню згадваецца ў летапісах з 1477 года. На пачатку XVII ст. яна перайшла ва ўладанне славутага канцлера ВКЛ Льва Сапегі. Малодшы сын канцлера Казімір Леў Сапега заснаваў тут шэраг касцёлаў і кляштараў, сярод якіх быў і кляштар манахаў Ордэна картузаў (картэзіянцаў) (1648 г.). У бярозаўскім картэзінскім касцёле ў 1665 г. пахаваны вялікі гетман ВКЛ і віленскі ваявода Павал Ян Сапега. Ад назвы кляштара паходзіць і назва мястэчка – Бяроза Картузская, якая раней паводле савецкіх ідэалагічных норм прывязвалася да іншых прыдуманых легенд. Цікава, што колішні вучань 11 класа Сялецкай сярэдняй школы Бярозаўскага раёна Алесь Разанаў агучыў яе ў сваім вучнеўскім вершы «Бяроза Картузская»:

*Аднойчы з салдатамі, – людзі гавораць*
*Тут колісь ішоў палкаводзец Сувораў.*
*Стаміліся дужа салдаты ў паходзе,*
*Зрабілі прывал на траве ў прахалодзе.*
*Прысеў і Сувораў у лёгкай знямозе,*
*Павесіў картуз на бліжэйшай бярозе* <...>
*З тых пор каля ціхае Ясельды-рэчкі*
*Бярозай Картузскай назвалі мястэчка* [1].

Пераход бярозаўскага ўладання да картузаў быў надзвычайным момантам у гісторыі мястэчка, што перш за ўсё адлюстравалася ў падтрымцы новымі ўладальнікамі развіцця гандлю і рамёстваў. І ўсё ж мястэчка да сярэдзіны XIX стагоддзя было маленькім, небагатым населеным пунктам. Яно некалькі разоў гарэла, цярпела ад чумы. У 1706 годзе тут адбылася сустрэча расійскага цара Пятра І з каралём польскім і вялікім князем літоўскім Аўгустам ІІ. У 1795 – у выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай – Бяроза апынулася ў складзе Расійскай імперыі. Пасля здушэння вызваленчага паўстання 1830–1831 гг. расійскія ўлады зачынілі кляштар картузаў. Значная частка яго будынкаў была разабрана на цэглу для пабудовы ваенных казармаў і праваслаўнай

царквы. У 1918 г. мястэчка было абвешчана часткай Беларускай Народнай Рэспублікі, потым – БССР. Аднак згодна з Рыжскай мірнай дамовай 1921 г. яно апынулася ў складзе міжваеннай Польскай Рэспублікі. У 1934 г. у мурах былых расійскіх казармаў была арганізавана вязніца для палітычных зняволеных – украінскіх і беларускіх змагароў за нацыянальнае вызваленне [2]. З 1939 г. Бяроза зноў у складзе БССР, са студзеня 1940-га яна стала цэнтрам новаўтворанага Бярозаўскага раёна і атрымала статус горада

Рашэнне аб стварэнні бярозаўскай раённай газеты было прынята на пачатку студзеня 1944 г. Па прапанове С. А. Яроцкага – тагачаснага першага сакратара Бярозаўскага падпольнага райкама партыі – было зацверджана назва «Полымя» («Пламя»). Першы нумар газеты выйшаў у свет 23 студзеня 1944 г. У перадавіцы, напісанай С. А. Яроцкім, ставіліся задачы перад партызанамі актыўна змагацца з нямецка-фашыскімі захопнікамі і змяшчаўся зварот да жыхароў раёна. Былі змешчаныя таксама невялікія карэспандэнцыі памочніка начальніка штаба 345-га атрада Мацвея Шалая, сакратара партбюро Андрэя Царыкова, камандзіра групы падрыўнікоў Івана Жолудзева і верш Паўла Піманенка «На захад». Загаловак газеты быў выразаны на невялікай драўлянай калодачцы. Друкавалася яна ў падпольнай друкарні. Пасля вайны газета стала называцца «Маяк камунізма» (1965 г.). З 1954 г. яна павялічыла аб'ём з двух старонак да чатырох. Перыядычнасць была тры разы на тыдзень. У перыяд 1962–1965 гг. газета была міжраённай – распаўсюджвалася ў Бярозаўскім і Івацэвіцкім раёнах. У 1991 г. выданне атрымала сённяшнюю назву «Маяк» і стала выходзіць два разы на тыдзень па 4 старонкі. У 1996 г. адбыўся яе пераход на камп'ютарны набор і вёрстку. З 1 красавіка 2002 г. кожны суботні нумар «Маяка» пачаў выходзіць на 8 старонках. Агульны аб'ём павялічаны да 12 старонак у тыдзень. У гэты ж час газета перайшла на поўнае самафінансаванне і распачала рэгулярны выпуск першай і апошняй старонак у двух колерах. Да 60-годдзя газеты 23 студзеня 2004 г. надрукаваны першы ў яе гісторыі нумар, у якім 4 старонкі – поўнакаляровыя. У наступным годзе па серадах газета стала выходзіць на 6 старонках, агульны аб'ём – 14 старонак у тыдзень. Потым з 1 ліпеня па суботах газета стала выходзіць на 10 старонках, агульны аб'ём – 16 старонак у тыдзень. У ліпені 2007 года адбылася поўная камп'ютарызацыя рэдакцыі [3].

Аднак, як вядома, рэдакцыя – гэта найперш людзі, супрацоўнікі, зацікаўленыя ў выніках сваёй працы, самааданыя працаўнікі на ніве журналісцкай творчасці, захопленыя гісторыяй роднага краю,

зацікаўленыя ў яго дабрабыце, эканамічным і духоўным развіцці. Безумоўна, змест і якасць кожнага выдання, яго рэдакцыйная палітыка вызначаюцца ў многім тым, хто стаіць на чале – галоўным рэдактарам, які задае тон і жыццю калектыву, і ідэйна-тэматычнай скіраванасці газеты. У гісторыі бярозаўскага «Маяка» ёсць адметны перыяд, звязаны з творчай дзейнасцю Аляксея Ягоравіча Клімава (1923–1990), які ўзначаліў рэдакцыю ў 1968 годзе і працаваў на гэтай пасадзе больш за 16 гадоў. Нарадзіўся Аляксей Ягоравіч у в. Малое Заточча Магілёўскага раёна. Да вайны паспеў скончыць дзевяць класаў. Пасля вайны закончыў журфак БДУ. У журналістыку Аляксей Ягоравіч прыйшоў на пачатку пяцідзясятых, узначаліўшы газету «Уперад да камунізма» палітаддзела Лагішынскай МТС. Пра тое, што выданне было аўтарытэтным, кажа той факт, што ў студзені 1954 г. (у трыццаць гадоў з невялікім) А. Я. Клімава прызначаюць рэдактарам Лагішынскай раённай газеты «Калгасная праўда». Пасля скасавання Лагішынскага раёна А. Я. Клімаў прызначаны на пасаду намесніка рэдактара Бярозаўскай раённай газеты «Маяк камунізма». На гэтай пасадзе ён адпрацаваў шэсць гадоў, а з 29 мая 1968 г. узначаліў выданне.

Паводле ўспамінаў калег, журналісцкія публікацыі А. Клімава вызначаліся актуальнасцю, аналітычнасцю і веданнем жыцця. Героем яго нарысаў і замалёвак быў чалавек-сучаснік, чалавек-працаўнік з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, адчувалася таксама асабістае стаўленне аўтара як журналіста і грамадзяніна да праблем тагачаснага жыцця. Маючы за плячыма цяжкі вопыт ваеннага ліхалецця, Аляксей Ягоравіч у сваёй журналісцкай і рэдактарскай дзейнасці кіраваўся як веданнем рэальнага жыцця, так і сумленнем, чалавечай мудрасцю, набытай у складаны ваенны перыяд. Яго баявы шлях пачаўся ў кастрычніку 1943 г. у 61-м партызанскім атрадзе на Магілёўшчыне, а скончыўся пасля цяжкага ранення ў лютым 1945-га ва Усходняй Прусіі. А. Я. Клімаў не любіў згадваць пра вайну. Можна было толькі здагадвацца, якім ён быў байцом і камандзірам, па тых узнагародах – ордэнах Айчыннай вайны і Чырвонай Зоркі, надзвычай шанаванага у франтавікоў медаля «За адвагу», медаля «За баявыя заслугі» і інш., якія зрэдку з’яўляліся на грудзях у Дзень Перамогі. Калі спрабавалі распытаць, за што іх атрымаў, ён у такіх выпадках бянтэжыўся, махаў рукой і казаў нязменна: «А-а, было і, дзякуй Богу, прайшло – чаго ўжо ўспамінаць». У архівах былі адшуканы яго ўзнагародныя лісты, паводле якіх выявіўся такі ў нечым унікальны факт: на працягу двух тыдняў ён быў двойчы прадстаўлены да ордэнаў. Ва ўзнагародных лістах напісана:

«У баях па знішчэнні акружанай ва Усходняй Прусіі групоўкі праціўніка з 14.02.1945 г. т. Клімаў, з'яўляючыся камандзірам аддзялення, паказаў воінскае майстэрства і асабістую мужнасць 15.02.1945 г. у баі за в. Зонвальдэ. Рота вымушана была залегчы пад моцным кулямётным агнём праціўніка, які засеў у доме, пераўтвораным у дзот. Тав. Клімаў са сваім аддзяленнем першым выйшаў да дома, з якога фашысты вялі агонь. Кінуўшы гранаты, байцы смела ўварваліся ў дом, знішчыўшы два станковыя кулямёты з разлікамі, захапілі пяць нямецкіх салдат у палон. Сваімі дзеяннямі т. Клімаў забяспечыў паспяховае прасоўванне роты наперад». За гэты подзвіг А. Я. Клімаў быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны другой ступені [4].

Да ордэна Чырвонай Зоркі ён быў прадстаўлены праз два тыдні: «28.02.1945 г. на паўночны захад ад в. Раўшбах праціўнік перайшоў у моцную контратаку, адкрыўшы ўраганны агонь з усіх відаў зброі. Тав.Клімаў мужна адбіваў саперніка, знішчаючы яго агнём свайго аўтамата. Будучы цяжка параненым, але яшчэ маючы сілы весці агонь, ён працягваў паражаць праціўніка і да канца бою заставаўся на сваім месцы. У гэтым баі тав. Клімаў са свайго аўтамата знішчыў сем нямецкіх салдат», – гаворыцца ва ўзнагародным лісце [4]. З гэтых казённых папер, напісаных пафаснай тагачаснай рыторыкай, тым не менш паўстае воблік мужнага і смелага чалавека, сумленнага і адказнага, якім і належыць быць салдату.

У цывільным жыцці Аляксей Ягоравіч Клімаў быў надзвычай інтэлігентны, далікатны і сціплы чалавек, аб чым сведчаць успаміны яго калег і вучняў. «А. Я. Клімаў не быў красамоўны, не ўмеў распыляцца ў пахвале, як і не чулі мы ад яго «разносаў». Ён быў на здзіўленне вытрыманы, роўны ў адносінах і ў нейкіх рэчах педантычны. Але ж мы добра ведалі, што за гэтай яго з першага погляду ўяўнай строгасцю, а недзе і непрыступнасцю крыецца найласкавейшая чалавечая душа, здольная прыйсці на дапамогу, як толькі паклічуць, гатовая ўважліва з дзіўным тактам выслухаць, даць добрую і мудрую параду. Аляксей Ягоравіч разумеў чалавечыя слабасці і ўмеў іх даравать. Іншы раз гэта здавалася дзіўным, а часам і незразумелым, – прыгадвае яго калега і вучань Аляксандр Іваноў. – У той жа час было дзіўным яго цярпенне, калі ён «правіў» маладых журналістаў. Тон яго голасу пры гэтым насіў як бы выбачальны характар, маўляў, усё так вось пачыналі, але цярпенне і праца ўсё перапруць. Тлумачыў літаральна кожнае слова сваёй рэдактарскай праўкі, дапамагаў знайсці самае ўдалае і ёмістае па семантыцы, любіў прыгожае азначэнне, цаніў удалы вобраз, а

яшчэ нестандартны паварот тэмы ставіў на першы план» [4]. Адным з такіх маладых журналістаў, дарэчы, была і выпускніца факультэта журналістыкі БДУ будучая Нобелеўская лаўрэатка па літаратуры Святлана Алексіевіч, якая працавала ў бярозаўскім «Маяку камунізма» ў 1972 годзе загадчыцай аддзела пісем.

«Маяк камунізма» стаў сапраўднай школай прафесійнага станаўлення для шматлікіх журналістаў, вядомых не толькі на Брэстчыне, у Рэспубліцы Беларусь, але і за мяжой. Тут набіраліся вопыту лаўрэат шэрагу рэспубліканскіх конкурсаў, супрацоўнік Віцебскай абласной газеты Аляксандр Тулбусаў, рэдактарамі раённых газет сталі Г. Радзюк, А. Губіч, А. Іваноў [5]. У перыяд рэдактарства А. Я. Клімава на старонках «Маяка» разгарнула сваю плённую дзейнасць літаратурнае аб’яднанне «Крыніца», заснаванае ў 1967 г. Бярозаўская зямля надзвычай шчодрая на таленты: Алесь Разанаў, Ніна Мацяш, Мікола Арахоўскі, Раіса Баравікова, Віктар Супрунчук, Зінаіда Дудзюк, Васіль Сахарчук, Анатоль Казловіч, Міхаіл Шыманскі, Андрэй Юдчыц. Усе яны – першыя птушкі выраю, крылы якому дало літаратурнае аб’яднанне «Крыніца». Літаратурная старонка «Крыніца» ў газеце «Маяк» існуе па сёння. Адказная за яе выпуск – загадчык аддзела сацыяльных праблем Маргарыта Гаравая, якая і сама піша вершы. Штомесяц на літстаронцы публікуюцца новыя творы як прафесійных аўтараў, так і пачаткоўцаў. Тут можна пачытаць творы Зінаіды Дудзюк, Маргарыты Гаравой, Уладзіміра Сіпягіна, Аксаны Валуй, Алёны Папко, Людмілы Гайчук, Ліліі Зінкевіч, Максіма Гансецкага, Ігара Шарая і інш. [6].

Разумная і ўзважаная рэдакцыйная палітыка папярэднікаў паставіла Бярозаўскую «раёнку» ў свой час у шэраг лепшых выданняў Брэстчыны. Менавіта ў той перыяд былі закладзены ў газеце шматлікія добрыя традыцыі, якія і сёння плённа працягваюцца ў «Маяку».

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Разанаў А.* Бяроза Картузкая [Электронны рэсурс]. URL: https://bereza-cbs.by/алесь разанаў/бяроза картузкая (дата звароту: 19.04.2021).
2. *Карлюкевіч А.* Старонкі радзімазнаўства. Мясціны Асобы [Электронны рэсурс]. URL: https://books.google.by/books?id=vxR9DwAAQBAJ&pg=PT41&lpg=PT41 (дата звароту: 26.04.2021).
3. *Братанов И.* В огне рожденная [Электронный ресурс]. URL: http://old.maiak.by/?page_id=1902 (дата обращения: 19.04. 2021).
4. *Иванов А.* Слово об Учителе [Электронный ресурс]. URL: http://old.maiak.by/?p=33838&cpage=1 (дата обращения: 19.04. 2021).

5. *Иванов А*. Жизнь и долг для него были едины //»Маяк», 13 сентября 2003 г.,
6. *Драган А*. «Крыніца» ставіць на крыло [Электронны рэсурс] URL: http://zviazda.by/ru/node/116850 (дата звароту: 26.04.2021).

## ОПЫТ ТРАНСФОРМАЦИИ РЕГИОНАЛЬНОГО СМИ: ОТ «МАЯКА» К BEREZA.BY

***Н. А. Федотова***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь*
*nf333@yandex.ru*

Публикация посвящена анализу практики регионального издания «Маяк». В 2020 году был создан новый сайт BEREZA.BY, изменены дизайн, рубрикация, тематика текстов. Рассмотрена приоритетная тематика Telegram-канала этого издания, отмечен существенный прирост пользователей на этой платформе (более чем в 7 раз за год).

***Ключевые слова:*** BEREZA.BY; дизайн; сайт; социальные сети; рубрики; трафик.

## REGIONAL MEDIA TRANSFORMATION: FROM THE «MAIAK» TO BEREZA.BY

***N. A. Fedotova***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. A. Fedotova (nf333@yandex.ru)*

The publication is devoted to the analysis of the practice of the regional periodical «Maiak». New website BEREZA.BY was created in 2020: the design, headings and texts were changed. The priority topics of the Telegram channel of this periodikal are considered. A significant increase in the namber of users on this platform is noted (more than 7 times during the year).

***Key words:*** BEREZA.BY; design; website; social networks; headings; traffic.

Сегодня грамотное присутствие СМИ онлайн и в социальных сетях – очевидная необходимость. По данным Левада-центра, динамика